## УВОД

У Лювэнскім унівэрсытэтце на курсе дапаможных гістарычных навукаў прафэсар-канонік Лефэўр даваў нам, студэнтам, параду, што казаць на пачатку кнігі й што — у канцы. На пачатку, раіў ён, паведамце чытачу, якою дарогаю ён пойдзе: скажэце, што ён пабачыць; зьвярнеце ягоную ўвагу на галоўныя мамэнты падарожжа; пакажэце, куды шлях завядзе яго. А ў канцы кнігі азірнецеся назад, нагадайце, якою дарогаю ён прайшоў, што пабачыў ды скажэце, якое значэньне ўсё гэта мае.

Дык вось: наша калектыўная дарога пачынаецца ў 1944 г. ў Баранавічах, ідзе на захад праз ваенную й паваенную Нямеччыну, кіруецца далей на поўнач празь Ля-Манш у маляўнічую Шатляндыю, заварочвае на поўдзень у цэнтральную Англію ды вяртаецца на эўрапейскі кантынэнт у Бэльгію, каб адтуль, пасьля гадоў супольных вандровак, разыйсьціся вузейшымі індывідуальнымі сьцежкамі ў розныя бакі. На гэтай дарозе сустрэліся й дамовіліся трымацца разам дванаццацёх беларускіх хлапцоў-бязбацькавічаў, якія пастанавілі прабівацца ў жыцьцё супольнымі сіламі. Спадарожнічаў ім на іхным шляху вобраз Бацькаўшчыны, страту якое яны востра адчувалі і на службу якой яны сябе паставілі. Ідэя вольнай Беларусі служыла ім арыентырам, трымала іх разам, давала імпульс да творчай і грамадзкай працы.

Ці ёсьць што-небудзь у іхнай гісторыі для сёньняшніх аднагодкаў у Беларусі? Адказ на гэтае пытаньне чытач знойдзе сам.

Кніга гэтая мэмуарна-дакумэнтальная. У ёй, разам з успамінамі, дзёньнікавымі запісамі ды выпісамі з эміграцыйнага друку, падаюцца таксама пажаданьні для моладзі ад дзеячоў беларускай паваеннай дыяспары, выказваньні самое моладзі, лісты, публіцыстычныя артыкулы й літаратурныя творы, аўтарамі якіх былі суб’екты нашага аповеду. Бальшыня зьмешчанага дакумэнтальнага матарыялу публікуецца ўпяршыню. Упяршыню таксама чытач у Беларусі азнаёміцца зь літаратурнымі творамі, што друкаваліся ў часапісе „Наперад!”, органе Дванаццаткі.

У кнізе адлюстраваны пэрыяд сярэдзіны мінулага стагодзьдзя зь ягоным мікра- і макракосмасам ды зь беларускімі вялікімі й малымі праблемамі. Чытач пабачыць, якім глыбінна творчым фактарам можа быць нацы-

янальнае ўзгадаваньне моладзі й нацыянальная сьведамасьць. Ён адчуе таксама праўдзівасьць словаў народнае песьні, якую сьпяваў у Бэльгіі беларускі студэнцкі хор Міколы Равенскага:„Дарагая мне староначка, на якой нарадзіўся…”.

Жыцьцё на эміграцыі, асабліва тады, калі табе забаронена наведаць паняволеную Радзіму, вучыць любіць свой край на павышаным эмацыянальным узроўні. Адарваны ад Бацькаўшчыны, апынуўшыся ў чужым навакольлі, чалавек знаходзіць у сабе новы стымул да самаўсьведамленьня й самазахаваньня. Сьведамасьць ягоная завастраецца ад страты свайго псыхалягічнага й культурнага асяродзьдзя, душа становіцца чульлівейшай да агульнага народнага гора й нацыянальных патрэбаў. Пра гэта красамоўна сказаў яшчэ ў пазамінулым стагодзьдзі наш суродзіч Адам Міцкевіч пра сваю родную Наваградчыну („Літва! Мая Айчына! Ты – нібы здароўе: // Цябе той цэніць, хто ўжо страціў. Зноў і зноў я // Табою мрою…”. – Пераклад Кастуся Цьвіркі). Падобную думку выказаў і Адамаў аднафамілец Кастусь Міцкевіч (Якуб Колас): „Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе ня маю сілы”…

Гісторыя Дванаццаткі, можна сказаць – гэта люстра душы кожнага беларуса, духовы патэнцыял якога ўключае ў сабе прыспаную сілу любасьці да роднага Краю, незмабілізаваную ва ўмовах прывычнага, шэрага, а часта й цяжкога штадзённага быту на сваёй роднай зямлі. Але дзесьці на самым дне душы гэтая сіла ляжыць, дрэмле. У экстрэмальных умовах яна абуджаецца й дае плён.

Кніга гэтая пісалася на парозе новага стагодзьдзя — тады, калі з Дванаццаткі засталося ў кантакце між сабой усяго пяцёх сяброў. Пра двух няма вестак. Рэшта – на тым сьвеце (глядзі „Эпілёг”). Пісаць давялося ў асноўным на матарыяле, што захаваўся ў маім асабістым архіве. Балазе шмат чаго засталося. Падсобілі таксама ўспамінамі й фатаздымкамі сябры па Дванаццатцы: Васіль Шчэцька, Янка Жучка, Паўлюк Урбан ды Цімох Вострыкаў. Карыснымі заўвагамі пра рукапіс кнігі, а таксама фатаграфіямі, падзяліліся рэгенсбургцы-міхэльсдорфцы-лювэнцы Вітаўт Кіпель і Зора Савёнак-Кіпель. Прыслалі патрэбныя фатаграфіі сяброўкі па гімназіі Юзэфа Брэчка-Найдзюк й Юля Андрусышыны, а таксама Юліна мама сп-ня Яніна Каханоўская. Адсьвяжыў маю памяць пра некаторыя сямейныя дэталі брат Аркадзь Вільчыцкі, які жыве ў Беларусі. Падбадзёрыла дадатнай ацэнкай першых разьдзелаў кнігі пляменьніца Лена Вільчыцкая, выкладчыца менскае ВНУ. З выдатнымі вынікамі папрацаваў над ілюстрацыямі для кнігі Аляксандар Сільвановіч. Дапамаглі парадамі ў афармленьні машынапісу Серж Трыгубовіч і Мікалай Дутко. Узбагаціла выгляд вокладкі сваім талентам Ірэна Рагалевіч-Дутко. Сталую маральную падтрымку на працягу гадоў працы над кнігай давала жонка Надзея. Усім – самая шчырая падзяка.

Бязумоўна, хацелася б бачыць больш матарыялу ад іншых сяброў Дванаццаткі – аповед быў бы багацейшы, паўнейшы, менш асабісты. Але, як кажуць, на няма суду няма.

У намаганьні аднавіць мінулае памяць часамі ажывала ад колішняга пасьпешлівага грызмолу ў запісной кніжыцы. Цяпер, як ніколі раней, адчуваеш трапнасьць кітайскага выслоўя: Найслабейшы алавік мацнейшы за наймацнейшую памяць. Маладыя! Не паддавайцеся ілюзіі, што вастрыня вашага ўспрыйманьня сьвету застанецца з вамі назаўсёды. Запісвайце ўсё, калі хочаце некалі мець абуджальніка свае кволае памяці.Падзеі ў кнізе пададзеныя менш-больш у храналягічнай пасьлядоўнасьці. У канву аповеду ўключаная таксама бэлетрыстыка з часапісу „Наперад!", калі ў ёй адлюстраваныя праўдзівыя мамэнты й эпізоды з жыцьця Дванаццаткі.

Кніга мае адзінаццаць разьдзелаў. У першым гаворыцца пра самую тэму — як яна нарадзілася. У наступных шасьцёх апавядаецца (з выкарыстаньнем лістоў, дзёньнікавых запісаў ды прэсавых матарыялаў) пра зараджэньне, жыцьцё й працу Дванаццаткі ў Нямеччыне, Вялікабрытаніі ды Бэльгіі. У VIII-м разьдзеле пададзеныя выбраныя мастацкія творы з часапісу „Наперад!". У IX-м зьмешчаныя публіцыстыка з „Наперaду", успаміны, лісты ды іншыя матарыялы. У X-м разьдзеле чытач знойдзе „Дадаткі": запаветы маладым ад старэйшых і выказваньні самое моладзі, узаемную дамову Дванаццаткі „Вератні", хроніку скаўцкага жыцьця ды іншае. У „Эпілёгу" (разьдзел XI) – коратка, наколькі ведама, пра долю кожнага з дванаццацёх пасьля 1954 г.

Гэтак вось у акіяне часу кідаю бутэльку з пасланьнем для маладых. Няхай яна даплыве да берагу, да другога сэрца, каб працягвалася повязь пакаленьняў, повязь раскіданых па сьвеце сыноў і дочак Беларускай Зямлі.



(ф 01)(1)

*Дванаццатка ў Лёндане (жнівень 1948 г.). Стаяць: (зьлева) Паўлюк Урбан, Леанід Карась, Міхась Вострыкаў, Уладзімер Цьвірка, Васіль Шчэцька, Янка Запруднік, Паўло Дзімітрук; (сядзяць, зьлева) Піліп Дзехцяр, Янка Жучка, Алесь Бута, Алесь Марговіч, Леанід Швайчук.*